**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Сярэдняя школа № 13 г. Гродна”**

# “ПАДАРОЖЖА
# Ў БЕЛАРУСКУЮ ХАТКУ”

**Музейны пакой “Беларуская хатка”**

**Сярэдняя школа№13 г.Гродна**

***Мэта:***пазнаёміць вучняў з сялянскім побытам, асноўнымі рэчамі, іх ужываннем і выкарыстаннем у сялянскай хаце; выхоўваць беражлівыя адносіны да гістарычнага мінулага Беларусі.

***Абсталяванне:*** мерапрыемства праводзіцца ў музейным пакоі “Беларуская хатка”, вучні апрануты ў нацыянальныя касцюмы, кожны будзе падыходзіць да пэўнай рэчы і расказваць пра яе.

**Ход мерапрыемства**

**Вучаніца1.** Уздыхаць па старых рэчах і вяртацца да старога ўкладу жыцця не варта, але ведаць, як жылі нашы дзяды-прадзеды, трэба. А пры святле свечкі на покуці ў бацькоўскай хаце, пры святле малітвы ў душы відаць і тое, што засталося ў мінулым.

**Вучань1.** Сёння нас запрашае да сабе ў госці беларуская сялянская хата. Давайце хутчэй збірацца. ***(Гучыць беларуская музыка.)***

Прыветна вокны пазіраюць, нібыта ў госці запрашаюць. Ну, добры выгляд хата мае. Цікава... Што ж нас тут чакае? ***(Стук у дзверы.)***

***(Гаспадары выходзяць: гаспадыня трымае хлеб-соль на ручніку, а гаспадар запаленую свечку).***

**Гаспадыня.** Міласці просім кожнага ў нашай хаце госцем быць.

**Гаспадар.** Чым багата хата?

**Гаспадыня.** Хлебам.

**Гаспадар.** Адкуль усходзіць сонца?

**Гаспадыня.** З хаты.

**Гаспадар.** А хлеб?

**Гаспадыня.** З пячной дзяжы.

**Гаспадар.** Як той хлеб есці?

**Гаспадыня.** Разам за сталом.

**Гаспадар.** А дзе яго ўзяці?

**Гаспадыня.** Ісці ў поле жаці.

**Гаспадар.** Дай нам, Божа, у полі роду, у хаце згоду.

**Гаспадыня.** Мяне мая бабуля вучыла, а я вас вучу. Перш чым важную справу рабіць, трэба хату прыбраць, стол чыстым абрусам заслаць. Хлеб, соль на стол пакласці і свечку запаліць. (***Гаспадыня кладзе на стол хлеб-соль на ручніку, а гаспадар ставіць свечку)***

**Вучань 2.** Пры ўваходзе ў хату нас сустракае печ.Яна займала ў сялянскай хаце важнае і пачэснае месца. Абагравала хату, у ёй варылі ежу, на ёй спалі, адпачывалі, лячыліся.

Да печы адносіліся як да жывой істоты. Забаранялася ўжываць «у яе прысутнасці» грубыя або непрыстойныя словы: «Няможна гэта казаць, бо печ у хаце», «Сказаў бы, ды печ у хаце».

Печ (а дакладней – падпечак) – месца знаходжання добрага духа – дамавіка, галоўныя «абавязкі» якога – клопат пра дабрабыт сям'і.

***(Дзяўчынка мяце венікам падлогу ад парога. Уваходзіць гаспадар.)***

**Гаспадар.** Ад парога хату не мятуць.

**Дачка.** Ай, ці так ужо важна, як месці, галоўнае ж, каб чыста было.

**Гаспадар.** Так-то яно так, дзетка, але ж хіба ты не ведаеш? То паслухай, што я табе скажу. Парог, як і печ, – месца ў хаце незвычайнае, з ім звязана мноства народных звычаяў, абрадаў і прыкмет. Парог лічыўся ў народзе месцам, дзе жывуць душы продкаў, якія могуць уплываць на людзей, на іх здароўе, заможнасць, узаемаадносіны з іншымі людзьмі. З гэтым вераваннем звязаны розныя звычаі, якія дайшлі да нас з часоў сівой даўніны. Найбольш вядомы з іх – рытуальнае сядзенне перад парогам напярэдадні паездкі, падарожжа. Абавязкова трэба было маўчаць. Гэта сімвалізавала далучэнне да свету продкаў-нябожчыкаў. Вядома прыкмета, якая забараняе вітацца праз парог, бо гэта можа прывесці да спрэчкі, непаразумення паміж людзьмі. А ці ведаеш ты чаму на вяселлі малады ўносіць на руках у сваю хату жонку?

**Дачка.**Не, не ведаю.

**Гаспадыня.**Пераступаючы з ёю парог, ён тым самым аберагае маладую ад адмоўных да яе адносін продкаў. А вось якія яшчэ існуюць звязаныя з парогам прыкметы. Чалавека, які ўваходзіць у хату, чакае непрыемнасць, калі ён спатыкнецца аб парог. А вось садзіцца на парог або станавіцца на яго народная этыка не дазваляе. Асабліва асцерагаюцца гэтага хлопцы і дзяўчаты, інакш іх чакае адзінота. Забаранялася садзіцца на парог і цяжарным жанчынам, бо дзіця народзіцца з дрэннай памяццю. Яшчэ адзін паэтычны звычай. Калі нявеста абходзіла з паклонам усіх, развітваючыся з бацькоўскім домам, яна кланялася да зямлі парогу і прасіла прабачэння. Як бачыш, дзетка, парог займаў значнае месца ў жыцці нашых продкаў.

Яшчэ практычна ў кожнай сялянскай хаце можна ўбачыць "павука"-ажурную канструкцыю з саломінак, якую падвешвалі да столі ў покуці над сталом. Такі выраб выконваў нейкую магічную функцыю і адначасова ўпрыгожваў інтэр'ер народнага жылля. У патоках цёплага паветра, якое ўздымалася ад ежы на стале, павук павалі паварочваўся то ў адзін, то ў другі бок, паблісквaючы залацістымі саломінкамі ў сонечных праменнях. Нашы продкі вывешвалі іх перад Новым годам на самым ганаровым месцы, каб яны аберагалі хату і гаспадароў. Праз год стары "павук" спальваўся і на яго месцы з'яўляўся новы. "Павука" падвешвалі і над калыскай немаўляці, а таксама над галовамі маладых у час вяселля. Меркавалі, што ў тым доме, дзе пад столлю кружыцца залацісты саламяны "павук", заўжды будзе панаваць згода, лад і дабрабыт **(падыходзіць і паказвае).**



**Вучаніца 2.** Ажыўлялі вясковую хату рэчы, зробленыя рукамі гаспадароў і вясковых умельцаў**.**

У кожным двары абжывалася цэлае сямейства кашоў, старых і новых, вялікіх і малых. Без іх, лёгкіх і зручных, не абыходзіліся ні дарослыя, ні дзеці. ***(Падыходзіць і паказвае )*** На паліцах знаходзіліся кашы с плеценымі вечкамі, у якіх захоўвалі сушаныя каўбасы, паляндвіцы, кумпякі, тут жа стаяў цэбар для гаспадарчых патрэб.



**Вучань 3.**А вось перад вамі бойка.***(Падыходзіць і паказвае)***Калі малако адстойвалася ў збанках, гаспадыня збірала зверху смятану – густы, тлусты слой. Назапашвала смятаны ўдосталь і біла з яе ў бойцы масла.

Бойка – высокая круглая кадачка, звужаная кверху. Рабілі бойку з клёпак або выдзёўбвалі з дрэва. Клёпкі найчасцей стругалі з елкі, гладка апрацоўвалі гэблікам і сцягвалі абручамі. Бойка мела накрыўку з адтулінаю пасярэдзіне – для калатоўкі-біла.




Масла білі ўручную. Калатоўка шпарка бегала зверху-ўніз, знізу-ўверх. Бегала доўга і без перадыху, каб смятана ў бойцы не астыла. Збіўшы масла, злівалі ў збанкі маслёнку. Кіславатая, з залацістымі крупінкамі масла, яна смачна сёрбалася потым з цёплаю бульбаю.

Прыгадваецца казка пра дзвюх жабак, якія трапілі ў пастку – збанок са смятанаю. Адна жабка адразу выдыхнулася, здалася і патанула ў смятане. А другая, упартая, доўга працавала лапкамі, як калатоўкаю, і збіла

са смятаны масла. Стала на грудку масла і выскачыла са збанка на волю. Казка цікавая і павучальная: ніколі не падайце духам, сябры, верце ў свае сілы – і зможаце выбрацца з любой пасткі.

**Вучаніца 3.**Гліняны посуд і сёння карыстаецца попытам. Прыгожа глядзіцца ён і на кухоннай паліцы, і на абедзенным стале.А ў нашых прашчураў гліняныя вырабы былі на любы густ, для розных патрэб.

Гэта – збан ***(падыходзіць і паказвае)***Пасудзіна добра вядомая. У ім звычайна трымалі малако: доўга не скісае, а ў гарачыню – халоднае. Бакі ў збана выпуклыя, шыйка – звужаная. Мае ручку і носік-дзюбку, каб тое ж малако лёгка, роўным струменьчыкам лілося ў міску ці ў кубак.





**Вучаніца 4.** Дзеці ў сялянскіх хатах засыналі пад калыханку матчыных красён. Рыпелі панажы, стукалі бёрда з набіліцамі. Хадзілі ўверх – уніз ніты – і ткалася палатно, белае ці расквечанае яркімі ўзорамі. На чарадзейных кроснах ткалася ўсё: ад грубага зрэб'я да тонкага кужалю. І сёння яшчэ ў вясковай хаце можна ўбачыць куфар **(падыходзіць і паказвае)**, дзе ляжыць скарб, вытканы на кроснах. Ручнікі не толькі ўпрыгожвалі інтэр'ер хаты, але і шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх абрадах**(падыходзіць і паказвае)**. На вяселлі хлебам-соллю на ручніку сустракалі маладых пасля вянчання ў царкве. Ручнікі дарылі родзічам маладога, але не ўсім, а пераважна мужчынам: маладому,яго бацьку, тату,дружыне маладога.Ужываўся ручнік і ў якасці падножніка, на які станавіліся маладыя ў час вянчання. Адыходзячы ад аналоя, нявеста старалася цягнуць за сабой і ручнік. Гэта рабілася для таго, каб сяброўкі цягнуліся за ёю,выходзілі замуж. У жалобнай абраднасці таксама прысутнічаў ручнік. На Палессі здаўна ручнікамі абвязваюць надмагільныя крыжы, каба здобіць магілы. Самых паважаных гасцей пад час урачыстасцей і зараз сустракаюць хлебам-соллю на прыгожых ручніках.





На ручніках, расшытых пеўнямі,
хлеб-соль падносім да гасцей,
вядзем за стол, каўшамі пеннымі
частуем брагай пагусцей.
І не хаваем–дзе падзенешся?-
сваіх пачэсных мазалёў.
А трэба – крынкаю падзелімся:
Лепш сто сяброў, чым сто рублёў.

(С.Грахоўскі)

**Гаспадыня.**Ёсць такая легенда. Чалавеку сказалі, каб ён, адыходзячы з хаты, не азіраўся назад, іначай ператворыцца ў слуп солі. Чалавек азірнуўся... Дый як жа не азірнешся, калі родная сядзіба – гэта цэлы свет. Наперадзе, за таямнічаю мяжою гарызонта новыя дарогі, новыя людзі, новы свет. Але на ўсё астатняе жыццё застаюцца ў памяці “парог, высечаны з успамінаў, дзверы на завесах цвыркуновай песні; вокны, зашклёныя вачамі блізкіх; хата, пакрытая крыламі ластавак...”

**Гаспадар.**Часцей азірайцеся, сябры, назад, у мінулае, каб не пагасла свечка на покуці – у бацькоўскай хаце, каб лягчэй было ісці наперад, у будучыню.

## Спіс выкарыставанай літаратуры

1. Варанецкая, Л.М., Бельская, К.М., Ждан,І.Л. Выхоўваем грамадзяніна/ Л.М.Варанецкая, К.М. Бельская, І.Л. Ждан//Мн.: – Зорны верасень,2008.
2. Інтэрнэт-рэсурсы.
3. Часопіс “Беларуская мова і літаратура”.